МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ КОЛЛЕДЖ

Репозиторий БарГУ

# АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ ПРОФОРИЕНТАЦИИ И ПРОФАДАПТАЦИИ

*Межвузовский сборник научных статей*

УДК 37.047(082)
ББК 74.200.52
А 43

**Научные редакторы:** кандидат психологических наук, доцент А.М. Кухарчук; кандидат психологических наук, доцент Л.Ф. Мирзаянова

**Рецензенты:** доктор педагогических наук, профессор, действительный член БелАО, заслуженный деятель науки Республики Беларусь А.П. Сманцер; доктор психологических наук, доцент В.А. Янчук

Рекомендовано к изданию Советом БГВПК, протокол № 164 от 30 января 2003 года.

**Актуальные проблемы профориентации и профадаптации:**
А 43 Сб. науч. ст. / Под науч. ред. А.М. Кухарчук, Л.Ф. Мирзаяновой.– Барановичи: БГВПК, 2003.– 182 с.

ISBN 985-6616-10-7.

Сборник, состоящий из двух частей, содержит статьи, посвященные профессиональному самоопределению молодежи и ее адаптации к вузовским условиям обучения и профессиональной деятельности. В первой части сборника освещаются вопросы, связанные с профессиональной направленностью личности, ее потребностями и интересами, устойчивостью профессиональных намерений; содержанием, формами и методами активизации профессионального самоопределения школьников. Во второй части представлены статьи, в которых рассматриваются различные аспекты профессиональной адаптации, среди которых ее теоретико-методологические основы, факторы, условия, кризисы, адаптирующие средства и др. Сборник адресуется специалистам, занимающимся профориентационной работой с молодежью, научным и практическим работникам в области образования, представителям высшей и средней школы.

УДК 37.047(082)
ББК 74.200.52

**ISBN 985-6616-10-7**

© БГВПК, 2003

ЧИТАЛЬНЫЙ ЗАЛ

Репозиторий БарГУ

Подобные экскурсии – новый аспект деятельности "Зеленой школы". Проводимые для младших классов, они обеспечивают преемственность между дополнительным экологическим образованием и программными занятиями экологической направленности в начальной школе. Являясь средством адаптации учащихся VII–VIII классов к проведению эколого-просветительской работы, экологические экскурсии выступают и средством ориентации учащихся средних школ на профессию учителя.

### Литература

1. Праграмы дванаццацігадовай агульнаадукацыйнай школы з беларускай мовай навучання. Падрыхтоўчы, I, II класы.– Мн., 1999.

2. Рындевич С.К. "Зеленая школа" как новая форма экологического образования и воспитания в Беларуси // Экологическое образование: проблемы и перспективы. Материалы рег. науч.-метод. семинара (Барановичи, 1999).– Барановичи, 1999.

3. Рындевич С.К. Зеленая школа. Программа по экологическому образованию и воспитанию. – Барановичи, 2000.

4. Рындевич С.К. Новый аспект функционирования "Зеленой школы" // Вестник общественных экологических организаций и инициатив Беларуси.– 2002.– № 3.

Репозиторий БарГУ

В.М. Шавель

## АПЕРАДЖАЛЬНАЯ АДАПТАЦЫЯ ДА ПЕРАДДЫПЛОМНАЙ ПРАКТЫКІ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЧЫТАННЮ

Прафесіяналізм настаўніка грунтуецца на сістэме яго псіхолага-педагагічных ведаў, глыбокім валоданні прадметамі спецыяльнага цыкла і практычным вопыце

у навучальна-выхаваўчай дзейнасці. Сувязь тэорыі з практыкай у працэсе выкладання вучэбных дысцыплін у педагагічнай установе – умова фарміравання падрыхтаванасці студэнтаў да эфектыўнага ўспрымання школьнага вопыту.

Значнасць педагагічнай практыкі заключаецца ў тым, што яна дае магчымасць назіраць рэалізацыю асноўных тэарэтычных палажэнняў педагогікі, псіхалогіі, прыватных методык у рэальных умовах школьнага жыцця, фарміраваць метадычную рэфлексію студэнтаў: прадметам іх разважанняў становяцца сродкі і мэты ўласнай педагагічнай дзейнасці, працэсы выпрацоўкі і прыняцця неабходных рашэнняў, выяўлення тых прычын, якія абумоўліваюць недахопы і нізкую выніковасць самастойнай педагагічнай дзейнасці.

Пераддыпломная практыка – завяршаючы этап прафесійна-практычнай падрыхтоўкі будучага настаўніка.

У анкетах па выніках пераддыпломнай практыкі студэнты-выпускнікі часцей за ўсё (47%) адзначаюць цяжкасці ў: а) распрацоўцы паўрочных і тэматычных планаў вучэбных заняткаў; б) вызначэнні аптымальнага аб'ёму новай інфармацыі (36%); в) фарміраванні ў школьнікаў творчага мыслення, культуры вуснай і пісьмовай мовы (28%); г) арганізацыі і спалучэнні калектыўнай і індывідуальнай пазнавальнай дзейнасці (25%); д) падтрыманні неабходнага тэмпу ўрока (20%).

Усё вышэйадзначанае выклікае ў студэнтаў незадавальненне ходам і вынікамі практычнай дзейнасці, эмацыянальны стрэс, зніжае часам прафесійную матывацыю. Вынікі даследаванняў патрабуюць арганізацыі папераджальнай адаптацыі студэнтаў да пераддыпломнай практыкі [1].

Рэпазіторый БарДУ

Паспяховая папераджальная адаптацыя забяспечваецца сістэмным дзеяннем псіхалагічных механізмаў. Яны запускаюцца як самой асобай адаптанта, так і асобамі, якія кіруюць дадзеным працэсам; рыхтуюць, у сваю чаргу, функцыяніраванне другіх механізмаў, якія ахопліваюць сваім дзеяннем адзін альбо ўсе этапы адаптацыйнага працэсу. Вядучымі першаснымі механізмамі папераджальнай адаптацыі студэнтаў з'яўляюцца, на думку Л.Ф. Мірзаянавай, механізм інтэрыярызацыі–экстэрыярызацыі, засваення відаў і форм педагагічнай дзейнасці і навучанне праз мадэляванне [2].

Зыходзячы з гэтага, для папярэджання цяжкасцей, з якімі сутыкаюцца студэнты ў час пераддыпломнай практыкі, выкладчык павінен забяспечыць тэарэтычны і практычны ўзровень прафесіяналізацыі: сфарміраваць унутраны план дзеянняў у формах і метадах прафесіянальнага мыслення, прадставіць аптымальныя мадэлі для назірання, уключыць студэнтаў у спецыяльна арганізаваную практычную дзейнасць з мэтай засваення вопыту прафесіянальнай дзейнасці, падаць магчымыя мадэлі для пераймання, стварыць умовы для сістэматычнага самастойнага ажыццяўлення мадэліравання паводзін, выклікаць жаданне іх здзяйсняць, сфарміраваць эмацыянальны вопыт станоўчага перажывання здзяйсняемых мадэліруемых паводзін.

Даследаванні паказалі, што найбольшыя цяжкасці адчуваюць студэнты пры арганізацыі і правядзенні ўрокаў на пачатковым этапе (0–I кл.) навучання (80% ад колькасці студэнтаў, якія трапілі на практыку ў гэтыя ўзроставыя групы). Таму пры рабоце над асаблівасцямі структуры і зместу ўрока ў перыяд навучання грамаце выкладчыку па методыцы беларускай мовы значны акцэнт

Рэпазіторый БарДУ

трэба зрабіць на патрабаваннях да ўрока. Глыбокага вывучэння патрабуе спецыфіка зместу ўрока (спецыяльныя мэты), якая выражаецца ў наступных канкрэтных метадычных патрабаваннях: забеспячэнне моўнай накіраванасці (размоўны характар урокаў), засваенне праграмнай лексікі (работа над значэннем і вымаўленнем слова, ужыванне яго ў звязным выказванні), развіццё навыкаў дыялагічнай і маналагічнай форм мовы ў вучняў; арганізацыя "слухання" мовы; правядзенне арфаэпічнай работы (практыкаванні ў слуханні і ўзнаўленні); развіццё аналітыка-сінтэтычных уменняў на разнастайных моўных узроўнях (фанетычным, граматычным), канструктыўных уменняў у дзяцей.

На занятках павінны разглядацца ўзоры фрагментаў урокаў, іх планаў-канспектаў, пры рэалізацыі якіх на практыцы могуць быць паспяхова выкананы як агульнадыдактычныя, так і спецыяльныя патрабаванні.

Варта прааналізаваць са студэнтамі не толькі магчымыя дыдактычныя структуры ўрокаў розных тыпаў, у якіх указаны мяркуемы змест кожнага структурнага этапа ўрока, але і вартасці і адмоўныя бакі (хаця б найбольш значныя) кожнага з іх. Студэнту вельмі важна ўжо пры падрыхтоўцы да пераддыпломнай практыкі ведаць, якую ацэнку зместу і методыкі ўрока ён атрымае на кожным этапе, асабліва магчымыя тыповыя пралікі, якія можна дапусціць.

Напрыклад, дыдактычная структура і змест урока з поўным цыклам пазнавальнай дзейнасці на пачатковым этапе навучання могуць быць наступнымі:

Рэпазіторый БарДУ

# Ход урока

| Структурныя кампаненты ўрока і іх змест: | Ацэнка зместу і методыкі ўрока: |
| --- | --- |
| I Паўтарэнне вывучанага матэрыялу. Актуалізацыя апорных ведаў.<br>Паўтарэнне, замацаванне і развіццё ведаў, атрыманых на папярэднім уроку. Паўтарэнне найбольш складанага матэрыялу папярэдніх урокаў. Актуалізацыя моўных уменняў і навыкаў, неабходных для засваення новага матэрыялу.<br>Магчымы змест, віды і формы работы (па выбару, у залежнасці ад мэт навучання):<br>установка на беларускую мову; замацаванне лексікі папярэдняга ўрока – складовы і гукавы (частковы і поўны) аналізы слоў (выкарыстоўваюцца цяжкія з боку вымаўлення), падбор слоў па схемах; канструяванне сказаў па схемах, з дадзенай формай, словам (словамі), па малюнку (малюнках), па пытанню і малюнку, паўтор рыфмаваных радкоў; складанне звязных выказванняў; чытанне тэксту, вывучанага на папярэднім уроку, гутарка па тэксту, пераказ; выразнае чытанне тэксту (у адпаведнасці з партытурай); чытанне тэксту па асобах; паўтарэнне вывучанага раней на памяць верша і г.д. | + рацыянальна выкарыстоўваўся час урока;<br>– недастатковы аб'ём матэрыялу для паўтарэння;<br>+ удала прадуманая сістэма заданняў;<br>+ выбраны эфектыўныя прыёмы паўтарэння;<br>– недастатковая гукавая работа;<br>+ удала сфармуляваны пытанні класу;<br>– дапушчаны памылкі ў гукавым аналізе;<br>– мала працавалі над канструяваннем сказаў;<br>+ удалая методыка работы над малюнкам;<br>+ умела выкарыстоўвалася нагляднасць;<br>– недастатковая работа над складаннем звязных выказванняў;<br>– захапленне франтальнымі гутаркамі;<br>– недастатковая арфаэпічная работа;<br>+ у час паўтарэння ажыццяўляўся комплексны падыход да вывучэння слова;<br>– мала чыталі;<br>– аднастайная работа над тэкстам;<br>+ выкарыстоўваліся разнастайныя віды пераказу;<br>– неабходна ўдасканаленне методыкі работы над вершаваным тэкстам. |
| II Матывацыя вучэбнай дзейнасці пры пераходзе да вывучэння новага матэрыялу, паведамленне тэмы і мэты ўрока.<br>Праблемныя сітуацыі, задачы, якія падводзяць да вывучэння новага матэрыялу; паведамленне тэмы і пастаноўка мэт навучання. | + удалая гутарка, якая падводзіць да новай тэмы;<br>+ створана праблемная сітуацыя;<br>– настаўнік не паставіў мэты ўрока, не вызначыў дакладна задачы навучання. |

і г.д.

Репозиторий БарГУ

Наяўнасць графы "Ацэнка зместу і методыкі ўрока" ва ўзорнай дыдактычнай яго структуры дае магчымасць студэнтам назапасіць вопыт рэфлексіі сваіх здольнасцей ажыццяўляць неабходныя паводзіны ў час педагагічнай практыцы.

Пададзены ў графе пералік асобных заўваг (станоўчых і адмоўных) гарантуе перажыванне студэнтамі поспеха ў канкрэтных сітуацыях, ствараемых выкладчыкам на занятках па выкарыстанню набытых тэарэтычных ведаў на практыцы (распрацоўка фрагментаў і планаў-канспектаў урокаў па беларускай мове і чытанню ў пачатковых класах, правядзенне панарамных фрагментаў і цэлых урокаў у межах практычных заняткаў і інш.).

Прапануемыя студэнтам дыдактычныя структуры ўрокаў арыентуюць іх на аптымальнае вырашэнне адукацыйных, развіццёвых і выхаваўчых задач, выкарыстанне запланаванага аб'ёму і зместу матэрыялу з улікам магчымасцей і падрыхтаванасці вучняў класа.

Пададзеныя патрабаванні і метадычныя каментарыі да структуры і зместу ўрока разглядаюцца намі і як крытэрыі ацэнкі спланаванага і праведзенага ўрока ў працэсе яго аналізу.

Узоры такіх дыдактычных структур урокаў змяшчаюцца ў педагагічныя скарбонкі, за неабходнасць складання якіх пасля пераддыпломнай практыкі выказваюцца 100% студэнтаў-выпускнікоў.

### Літаратура

1. Методыка выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах / Пад рэд. А.П. Шанько.– Мн., 1986.

2. Мирзаянсва Л.Ф. Упреждающая адаптация к педагогической профессии: Монография.– Барановичи, 1999.

Репозиторий БарГУ